388093

# Беларуская мова

## 9 клас

## Дыктанты, пераказы, пераклады



Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*Пад рэдакцыяй П.А. Міхайлава*

Рэкамендавана Цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Нацыянальнага інстытута адукацыі

*2-е выданне*

Мінск
«Аверсэв»
2005

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 372.881.116.13.046.14
ББК 74.268.1Беи
Б43

***Аўтары:***
І. Л. Бурак, А. І. Лаўрэнаў, П. А. Міхайлаў,
Т. Я. Старасценка, Н. У. Чайка

**Беларуская** мова: Дыктанты, пераказы, пераклады:
Б43 9 клас: дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў/І. Л. Бурак, А. І. Лаўрэнаў, П. А. Міхайлаў і інш.; Пад рэд. П. А. Міхайлава. — 2-е выд. — Мн.: Аверсэв, 2005. — 255 с.
ISBN 985-478-515-7.

Дапаможнік падрыхтаваны ў поўнай адпаведнасці з дзеючымі праграмамі па беларускай мове для 9 класа ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання.

Кніга складаецца з самастойных раздзелаў, якія адпавядаюць асноўным вучэбным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай праграмамі і падручнікамі. Кожны раздзел змяшчае тры віды пісьмовых работ — дыктанты, пераказы, пераклады, мэтанакіравана падабраныя аўтарамі для замацавання атрыманых тэарытычных ведаў вучняў па канкрэтнай тэме.

Адрасуецца настаўнікам і вучням школ, гімназій і ліцэяў.

**УДК 372.881.116.13.046.14**
**ББК 74.268.1Беи**

ISBN 985-478-515-7

© Калектыў аўтараў, 2002
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2002

# ПРАДМОВА

*Гэты дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання ведаў па беларускай мове. Ён складзены ў поўнай адпаведнасці з дзеючымі вучэбнымі праграмамі[1] і падручнікамі[2] па беларускай мове для 9 класа ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання, а таксама з улікам «Адзінага моўнага рэжыму ўстановы, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі».*

*Кніга складаецца з шасці самастойных раздзелаў: «Складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне», «Складаназлучаныя сказы», «Складаназалежныя сказы», «Бяззлучнікавыя складаныя сказы», «Складаныя сказы з рознымі спосабамі сувязі частак», «Сінтаксічныя канструкцыі з простай і ўскоснай мовай». Гэтыя раздзелы адпавядаюць асобным вучэбным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай праграмай і падручнікамі для 9 класа. Апошні раздзел «Сінтаксічныя канструкцыі з простай і ўскоснай мовай» прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ толькі з беларускай мовай навучання, паколькі згодна з праграмай у школах з рускай мовай навучання дадзеная тэма вывучаецца ў восьмым класе.*

---

[1] Беларуская мова. IV—VI класы 12-гадовай агульнаадукацыйнай школы, IV—XI класы 11-гадовай агульнаадукацыйнай школы: Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання. Мн.: НМЦэнтр, 2002.

Беларуская мова. IV—VI класы 12-гадовай агульнаадукацыйнай школы, IV—XI класы 11-гадовай агульнаадукацыйнай школы: Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання. Мн.: НМЦэнтр, 2002.

[2] Протчанка В. У. Беларуская мова: Падручнік для 9 класа школ з беларускай мовай навучання. Мн.: Нар. асвета, 1999, 2002.

Гардзей Н.М. і інш. Беларуская мова: Падручнік для 9 класа школ з рускай мовай навучання. Мн.: НМЦэнтр, 2000.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апреле 1900 года, всё население провожало его в последний путь. На памятнике, воздвигнутом на могиле Айвазовского, начертано: «Рождённый смертным оставил по себе бессмертную память».

*По М. Андреевой*

**СЛОЎНІК**

а р о м á т — духмя́насць, пах, вóдар
в п е ч а т л é н и е — урáжанне
з а п е ч а т л е в á т ь — адлюстрóўваць, увасабля́ць
з р и́ т е л ь н ы й — зрóкавы
и з о б р а ж á т ь — стварáць вóбраз, малявáць, пакáзваць, адлюстрóўваць
п á р у с — вéтразь
п л á м е н н о — палымя́на, гóрача, пáлка, з запáлам
п о и́ с т и н е — сапраўды́, па прáўдзе, на самóй спрáве
с о в е р ш é н н о — зусíм, цáлкам
с у́ д о р о ж н о — су́таргава

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Адкажыце на пытанні:
   Калі нарадзіўся Айвазоўскі?
   Якія ўражанні рабіла на яго мора?
   Дзе вучыўся Айвазоўскі? Кім ён стаў пасля заканчэння вучобы?
   Як працаваў мастак?
   Чаму Айвазоўскага называюць песняром мора?
   Як называецца найбольш вядомая карціна мастака? Апішыце яе.
   Як народ ушанаваў памяць вялікага мастака?
2. Вызначце стыль і тып тэксту, яго тэму і асноўную думку.
3. Запішыце адказы на пытанні.
   Складзіце план і напішыце пераказ тэксту па-беларуску. Выкарыстоўвайце складаназалежныя сказы.

**ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН**

1. Нараджэнне будучага мастака.
2. Бясконцая любоў да мора.
3. Выключны талент і працавітасць.
4. «Дзевяты вал» — гімн песняра мора.
5. Ушанаванне памяці вялікага мастака.

# БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ

## ДЫКТАНТЫ

### ПАПЕРАДЖАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

**Вясна**

Вясна прыносіла заўсёды свой мікраклімат. З паўднёвага, сонечнага, боку хаты капяжы аж заходзяцца ад сонца і цеплыні, прызба адтала — на ёй можна пасядзець, пагрэцца, нават зняць шапку і расшпіліць кажух. А на паўночным баку капяжы аж сця́ліся ад марозу, там яшчэ гурбамі ляжыць снег, зіма настойліва лезе пад шапку — шукае твае вушы. Гэта трохі пасля вада пойдзе пад снегам, тады ўжо ўзбоч дарогі трэба ступаць асцярожна — так і глядзі: ускочыш у ваду па самыя калені. Потым загамоняць ручаі: на ноч яны будуць перасыхаць, як, скажам, горныя рэкі, калі няма ў гарах дажджоў, а раніцою прачынацца і паціху-паціху запаўняць свае рэчышчы — аж пакуль не загамоняць сапраўдныя віры. **А пасля ўжо разыдзецца і Вуллянка: яна робіцца шырокай, сапраўднай ракою**, не месціцца **нават у сваіх берагах і залівае луг па самыя акопы.** Яна цэлы дзень шуміць, бурліць, на штосьці злуецца пад зарэчанскім мостам і не супакойваецца нават на ноч. І тады, засынаючы, усё яшчэ чуеш: рака варочаецца ў берагах, і імкнешся зразумець, што Вуллянка хоча сказаць і на каго яна так раззлавалася, разбушавалася... (170 слоў)

*Паводле Я. Сіпакова*

5 Зак. 3216



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**ЗАДАННІ**

1. Знайдзіце ў тэксце бяззлучнікавыя сказы. Вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж іх часткамі. Які сказ адпавядае схеме: [ ], [ ] — [ ].? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў ім.
2. Пабудуйце схему выдзеленага сказа.
3. Зрабіце марфемны аналіз слоў: **прыносіла**, **настойліва**, **зарэчанскі**, **сонечны**.

## Над Нёманам

Над абрывістым берагам Нёмана стаяў стары прысадзісты тоўсты **дуб**. Доўгі час бераг знаходзіўся пад вадою, паволі асоўваўся і агаляў тоўстыя карэнні старога дуба. Сам гэты дуб крыху пахіліўся набок, працягнуты над **вадою** яго корань здаваўся нагою — выходзіла так: дуб збіраўся перабрысці Нёман. Сеўшы на гэтым корані, Базыль бачыў: беглі дробныя хвалі, звівалася ў вадзе **доўгая** раска; вада то ўздымала яе, то апускала, то раскідала ва ўсе бакі і гуляла ёю, як вецер дымам.

Каля самага берага стаяў у вадзе лазовы куст. Ён тое і рабіў, што **борздзенька** ківаўся пад напорам вады. І ніколі не меў спачыну гэты куст: і ўдзень і ўночы ківаўся ён. Хіба, можа, зімою, як марозы скуюць лёдам ваду, **адпачне** гэты пахілак-куст.

Базыль пазіраў і думаў. А вакол было ціха. І Базылю здавалася: ён чуе спевы гэтай цішыні. Доўга ён прыслухоўваўся, але спевы былі нейкія невясёлыя. Хлопцу стала маркотна: усё ішло, здавалася яму, сваёю дарогаю і жыло сваім жыццём, сярод якога ён пачуў сябе чужым.

Але гэты магутны, хоць і адзінокі дуб усяляў у душу хлопца надзею: ён **адчуваў**, што набярэцца моцы і вытрывае ўсе жыццёвыя нягоды. (181 слова)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайдзіце ў тэксце сказы, якія адпавядаюць схемам:
   [ ], [ ] — [ ]: [ ].
   [ ]: [ ].



Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.
2. Зрабіце фанетычны аналіз выдзеленых слоў.

## Подых вясны

Дыхнула вясна — зямля стала вясёлая.

У прагным жаданні парыліся ўзгоркі, лагчыны купаліся ў тумане. І гулкая ні то цішыня шырокіх размахаў, ні то песня веснавой вясёлай журбы плыла над зямлёй: зямля чакала часу ўзняць сабраныя сілы сваёй творчай здольнасці і ў лагчынах драмала пад сонцам, драмала з подыхам шырокім сіняму небу.

Ночы былі зычныя, далёка гулкія і пахлі вадою: вады на зямлі было многа.

Як чакала зямля людзей у свае палявыя палосы, таксама і людзі чакалі зямлю. Чакалі яе, падсохлую, новую. Чакалі працы паржавелыя за зіму плугі і бароны.

І яшчэ чакалі вясну людзі: прычакаўшы вясны адной, чакалі другой. **Зямля была яшчэ чорная, лясы былі сінія: гэта пара ад зямлі агортвала іх, яны ж агортвалі сабой людзей.** Ды яшчэ ці мала людзей хадзіла па нізкіх кустах, па мокрых алешнікавых паплавах, у гушчарніках лазовых за рэчкамі. Гэта вясна дазволіла ім пакінуць вёскі. Прапахлі людзі гэтыя вільгаццю веснавой зямлі, вясёлымі мхамі. І начамі цягнуліся вясновыя гукі па родных мясцінах. І былі гэтыя гукі надзвычай гулкімі і па-вясноваму звонкімі. А людзі чакалі вясну. (169 слоў)

*Паводле Кузьмы Чорнага*

**ЗАДАННІ**

1. Знайдзіце складаныя сказы з бяззлучнікавай сувяззю. Пабудуйце схемы гэтых сказаў. Растлумачце сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі складаных бяззлучнікавых сказаў.
2. Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленага сказа.
3. Зрабіце марфалагічны разбор слоў: **жаданне**, **драмала**, **падсохлы**, **родны**.

## Восень

Па небе **шпарка** ляцяць цёмныя воблакі. Распаўзаюцца, чапляюцца, збіраюцца ў адзін груд і засцяць



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

неба. Смоўжам звілася над зямелькаю брудна-шэрая аграмадная пялёнка; яна хавае сонца. Сцюдзёна. З неба белым дымам ляцяць **сняжынкі**, сіроткамі сыплюцца аднекуль згары, з **няяснасці**; яны выплываюць і мякка кладуцца на зямлю.

Бывае так, што сярод холаду, шэрасці, пустэльнасці і нуды асенняй прыроды, сярод прыкрага надвор'я самай позняй восені на небе неяк раптоўна прагляне маленькі сіненькі лапічак — адзін, другі, трэці. Вось ужо немалая частка неба **вызваляе**цца з-за хмар — сіняя, радасная; яшчэ лёгка плывуць па яе берагах прыгожыя фарбы цёмных пасярэдку і белых наўкол воблачак. Яшчэ вісіць чорная, **дажджавая** туча далёка-далёка над лесам, як быццам яна там дужа добра ўчапілася. А зірніце, зірніце хутчэй: вунь там шпарка **схавалася** апошняя срэбная хмарка цераз сонца. Бліснуў з неба першы сноп светлага калосся на крыллі пруда-ветрака, перабег залатой пасцілкаю цераз сад — і ўсё весялее, робіцца прыгожым: **ціхенька** варухнуліся галінкі на старой бярозе, **убачыўшы** сонца, мякчэйшай хоча быць мёрзлая груда пад нагамі дзяўчыны. Дзяўчына схапіла вёдры, бяжыць да вады, бяжыць і нечага **смяецца**, а сонейка забылася, забавілася, любуецца дзявоцкаю прыгажосцю. (178 слоў)

*Паводле М. Гарэцкага*

**ЗАДАННІ**

1. Знайдзіце сказы, якія адпавядаюць схемам:
   [ ]; [ ].
   [ ], [ ] — [ ]: [ ], [ ].
   Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.
2. Вызначце, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы. Разбярыце іх па саставу.

## Музыка ў камені*

Помнікі архітэктуры старажытнага Нясвіжа даюць магчымасць прасачыць, як з'явілася і развівалася ў Беларусі барока.

Пасля Люблінскай уніі 1569 года, якая злучыла Вялікае княства Літоўскае і Польшчу ў адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую, Нясвіж зрабіўся месцам



жорсткай рэлігійнай барацьбы. Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка выгнаў з горада пратэстантаў, паводле яго ўказання сталі будавацца каталіцкія храмы.

З Рыма ў Рэч Паспалітую прыбыў архітэктар Ян Марыя Бернардоні — вучань італьянскіх дойлідаў Джакома Порта: ён прымаў удзел у будаўніцтве праслаўленай царквы Іль Джэзу ў Рыме. Сіротка запрасіў Бернардоні ў Нясвіж — па праектах італьянскага дойліда былі ўзведзены замак, касцёл і калегіум езуітаў.

Адначасова пачалася перабудова ўсяго горада: па апошняму слову еўрапейскай тэхнікі Нясвіж быў абведзены валамі і бастыёнамі. Размяшчэнне вуліц, плошчаў, новых будынкаў падпарадкоўвалася задачам абароны, да нашых дзён захаваліся два такія збудаванні — Слуцкая брама і вежа Замкавай брамы.

Адзін з найцікавейшых архітэктурных помнікаў Нясвіжа — сярэднявяковы феадальны замак; ён з часам, пасля некалькіх перабудоў, ператварыўся ў палацава-замкавы ансамбль. У ім змяшчалася мноства розных стыляў, што сведчыць аб выкарыстанні мастацкіх дасягненняў розных гістарычных эпох. (168 слоў)

*Паводле К.Я. Шышыгінай-Патоцкай*

**ЗАДАННІ**

1. Знайдзіце ў тэксце бяззлучнікавыя складаныя сказы, вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж іх часткамі.
2. Якія сказы адпавядаюць ніжэйпрыведзеным схемам?
   [ ]: [ ].
   [ ], [ ].
   [ ] — [ ].
   Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.
3. Зрабіце словаўтваральны аналіз слоў: **прасачыць, пратэстант, адначасова, падпарадкоўвацца.**

# ТЛУМАЧАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

## Надыход восені

Восень падкрадвалася заўсёды **ціха**. Спачатку заўважаеш: пастухі не **прыганяюць** ужо кароў на абед, дзень



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стаў маленькі, няма той спёкі. Вечарам, **услухоўваючыся** ў **восеньскія** гукі, адзначаеш: робяцца ўсё гучнейшымі вечары на пачатку восені — звонкія, гулкія, у ядраным паветры ўсё вельмі далёка чуваць!

Потым прыкмячаеш: пад цяжарам пладоў апусцілі на падпоры сваё зялёнае крылле сады. Сарвеш антонаўку, правядзеш па ёй даланёю — як свежа яна зарыпіць. Бывае, унадзіцца ў сады моцны вецер. Пашастае, паходзіць, паносіцца між яблынь. Выйдзеш ноччу на двор і адразу бачыш змену: раней было светла ад яблыкаў уверсе, дзе кроны дрэў, а цяпер быццам нехта **перавярнуў** яблыні — ад яблыкаў аж бела на зямлі, а кроны **нязвыкла** палохаюць **халоднаю**, нейкай трагічнаю чарнатою.

Ды нават і без дапамогі ветру ў сады прыходзіць сумны час: дрэвы, вызваліўшы галіны з-пад цяжару, шумяць усё роўна **невясёла**, нібы сумуючы па яблыках, — яны цяпер ляжаць на зямлі ў вялізных грудах. Пройдзе час, плады вывезуць з саду — тады ён здасца яшчэ больш сумным. Зірнеш — і мала дзе ўбачыш адзінокі яблык, што блішчыць між лісця на апошнім сонцы. (168 слоў)

*Паводле Я. Сіпакова*

**ЗАДАННІ**

1. Знайдзіце ў тэксце і выпішыце складаныя бяззлучнікавыя сказы з двукроп'ем. Вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі.
2. Які сказ адпавядае схеме: [ ] — [ ].? Растлумачце пастаноўку працяжніка паміж часткамі гэтага сказа.
3. Зрабіце словаўтваральны аналіз выдзеленых слоў.

## Бацькаў сад

Сад гэты пасадзіў калісь Арцёмаў бацька — Ігнат Дабрынеў. Арцём яшчэ помніць: **яны** з бацькам капалі пад вокнамі ямкі. Саджанцы, здаецца, бралі ў Панькаўскім лясніцтве. Бацька ўсё гаварыў Арцёму, што ўзімку будуць паляваць на зайцоў. Тыя **абавязкова** прыйдуць сюды: **маладыя** яблынькі для іх ежа.



Але пачалася фінская вайна, бацьку забралі — гэта здарылася ўначы: да іхняй хаты раптам пад'ехала грузавая машына, нехта трывожна пастукаў у акно. Арцём не паспеў ускочыць з **ложка**, як пачуў над сабой вясёлы бацькаў голас: ты, маўляў, не сумуй тут, Арцёмка, сцеражы сад, каб зайцы не паелі, а мы хутка вернемся. Але пачалася зіма. У тую зіму загінуў Арцёмаў бацька і вымерз **ледзь** не да апошняга дрэва малады сад. Тыя ж нямногія дрэўцы, што неяк уцалелі, доўга-доўга, ажно цэлых пятнаццаць гадоў, не пладаносілі. Зацвіталі часта, здаралася, і ўвосень давалі цвет, а яблыкаў усё не было.

І толькі нядаўна, у самыя апошнія гады, кончыўся **пустацвет** і сад пачаў пладаносіць. І весела стала тады ў Арцёмкавым садзе: на маладых яблыньках скрозь віселі сакавітыя духмяныя яблыкі. Хлопчык з сябрамі частаваўся яблыкамі і з удзячнасцю ўспамінаў бацьку. (16[illegible] слоў)

*Паводле І. Чыгрынава*

**ЗАДАННІ**

1. Знайдзіце ў тэксце складаныя сказы з бяззлучнікавай сувяззю і растлумачце сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі.
2. Знайдзіце сказ, які адпавядае схеме: [ ], [ ] — [ ]: [ ], [ ]. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі і падкрэсліце граматычныя асновы ў гэтым сказе.
3. Зрабіце фанетычны аналіз выдзеленых слоў.

# ВОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

## Летняя навальніца

Навокал ціха: не чуваць ні ветру, ні шуму, ні гоману трывожнага дня. Спакой і цішыня ночы даюць магчымасць прасачыць грозную і дзіўную музыку грому: як ён грыміць у далёкім небе, як крэпне паволі, **разліваецца** грукатам ва ўсіх кутках соннага свету, над лесам і полем, у гарах, далінах, у **бяскрайнім**



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прасторы высокага неба. Яму адзываецца на зямлі рэха сотнямі галасоў: страшнымі хвалямі **здрыганецца** паветра, адгукнуцца гулка далі і прасторы. А маланкі ўсё блішчаць і блішчаць. **Прыгледзьцеся: бледна-чырвоныя каласы агню ўспыхваюць то асобнымі стужкамі, то зліваючыся ў адну шырокую раку агню.** Бляск разліваецца па небе то роўнаю паласою, то **вогненнаю** ракою, то шырока, **размашыста** і смела бліснe ва ўсе бакі, усё роўна як разарвецца там, у хмарах, вялікая, грозная лавіна агню. Цьма разрываецца — выскачыць далёкі лес, выгляне круглае поле на ўсю даль, бліснуць далёкія хаты і царква разам з вянком ліп, клёнаў і бяроз. **Бліснe маланка — мільёны лістоў адсвецяцца золатам, дзіўна-хораша асвятляцца царкоўныя вежы высока ў небе.** (154 словы)

*Паводле Якуба Коласа*

ЗАДАННІ

1. Падзяліце тэкст на абзацы. Запішыце, як вы яго запомнілі.
2. У выдзеленых сказах вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.
3. Зрабіце марфемны аналіз выдзеленых слоў.

## Вялікі асветнік

**Пэўна ж, Скарына любіў гэтую працу — працу садоўніка: яна гаіла зялёным пошумам яго жыццёвыя раны.** Другая прафесія — садоўніка-медыка — **зноў** памагала яму ў нягодзе. А можа, гэта была для яго і **зусім** не другая прафесія, а адна і тая ж праца — выдаваць кнігі, узгадоўваць дрэвы. Бо дрэвы **ж таксама** як людзі. І як людская мудрасць жыве ў кнізе — адбяры яе, і чалавек можа забыцца, што ён чалавек, так усё багацце садавіны жыве ў гэтых прышчэпах — маленькіх культурных галінках. **Кінь семечка з найсмачнейшай яблыні —вырасце толькі дзічка.** І ён праз усё сваё жыццё выдаваў кнігі, **шаноўна** ўзгадоўваў моладзь. І на Градчанах, у братняй Чэхіі, працягваючы свае ствалы і галіны ў будучыя стагоддзі, дрэвы шапацелі яму лістотаю маленства, матчынаю моваю. (119 слоў)

*Паводле А. Клышкі*



ЗАДАННІ

1. Запішыце тэкст, як вы запомнілі яго, выкарыстоўваючы складаныя бяззлучнікавыя сказы.
2. Знайдзіце ў сваім тэксце складаныя бяззлучнікавыя сказы. Вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі ў іх і растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.
3. Пабудуйце схемы выдзеленых сказаў і зрабіце іх поўны сінтаксічны разбор.
4. Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых слоў.

# ТВОРЧЫЯ ДЫКТАНТЫ

## Вясковая раніца

Над зямлёю дробна праменілася сонца. Лес, што падступаўся на левы бок да самых Бароў, здаваўся, бліскучы, і гэты яго бляск быў чамусьці ненатуральны, не лясны: там, паміж соснаў і елак, раслі асіны, і, відаць, гэта яны, мокрыя ад расы, серабрыліся на сонцы. Лес маўчаў. Затое над пасінелым ад цвету бульбяным полем, угары, нават вышэй за сонца, не даваў сцішыцца раніцы жаўранак. Сонца, вялікае, бясконца і роўна ліло на зямлю чыстае святло, нібы спрабуючы затапіць яе ім; жаўранак, маленькі, шэры камячок, які недзе згубіўся ў гэтым акіяне святла, пасылаў на зямлю сваю дрыготкую, але прыгожую песню. І было штосьці агульнае і ў гэтай адзінокай жаўранкавай песні, і ў акіяне сонечнага святла. Нечым адным — прамяністым і звонкім — поўнілі яны сёння вясковую раніцу. (120 слоў)

*Паводле І. Чыгрынава*

ЗАДАННІ

1. Завяршыце апісанне летняй раніцы ў вёсцы, выкарыстоўваючы бяззлучнікавыя сказы, якія адпавядаюць схемам:



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Змест

Прадмова ........ 3

СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ:
БУДОВА, ЗНАЧЭННЕ, УЖЫВАННЕ

ДЫКТАНТЫ ........ 7

Папераджальныя дыктанты ........ 7
Тлумачальныя дыктанты ........ 9
Дыктанты «Правяраю сябе» ........ 11
Выбарачныя дыктанты ........ 14
Творчыя дыктанты ........ 16
Кантрольныя дыктанты ........ 19

ПЕРАКАЗЫ ........ 22

ПЕРАКЛАДЫ ........ 42

СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫЯ СКАЗЫ

ДЫКТАНТЫ ........ 47

Папераджальныя дыктанты ........ 47
Тлумачальныя дыктанты ........ 49
Дыктанты «Правяраю сябе» ........ 51
Выбарачныя дыктанты ........ 53
Творчыя дыктанты ........ 56
Кантрольныя дыктанты ........ 57

ПЕРАКАЗЫ ........ 61

ПЕРАКЛАДЫ ........ 80

СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫЯ СКАЗЫ

ДЫКТАНТЫ ........ 85

Тлумачальныя дыктанты ........ 85
Дыктанты «Правяраю сябе» ........ 88
Каменціраваныя дыктанты ........ 90



Выбарачныя дыктанты ........ 93
Вольныя дыктанты ........ 96
Творчыя дыктанты ........ 98
Папераджальныя дыктанты ........ 101
Дыктанты «Пісьмо па памяці» ........ 103
Кантрольныя дыктанты ........ 105

ПЕРАКАЗЫ ........ 108

ПЕРАКЛАДЫ ........ 121

Пераклад-пераказ ........ 126

БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ

ДЫКТАНТЫ ........ 129

Папераджальныя дыктанты ........ 129
Тлумачальныя дыктанты ........ 133
Вольныя дыктанты ........ 135
Творчыя дыктанты ........ 137
Дыктанты «Пісьмо па памяці» ........ 138
Дыктанты «Правяраю сябе» ........ 140
Выбарачныя дыктанты ........ 142
Кантрольныя дыктанты ........ 144

ПЕРАКАЗЫ ........ 150

СЦІСЛЫЯ ПЕРАКАЗЫ ........ 158

ПЕРАКЛАДЫ ........ 162

Пераклад-пераказ ........ 166

СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ
З РОЗНЫМІ СПОСАБАМІ СУВЯЗІ ЧАСТАК

ДЫКТАНТЫ ........ 169

Папераджальныя дыктанты ........ 169
Каменціраваныя дыктанты ........ 172
Тлумачальныя дыктанты ........ 175
Дыктанты «Правяраю сябе» ........ 177
Выбарачныя дыктанты ........ 180
Вольныя дыктанты ........ 183
Творчыя дыктанты ........ 185
Дыктанты «Пісьмо па памяці» ........ 187
Кантрольныя дыктанты ........ 188

ПЕРАКАЗЫ ........ 191

ПЕРАКЛАДЫ ........ 199

Пераклады-пераказы ........ 207



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## СІНТАКСІЧНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ З ПРОСТАЙ І ЎСКОСНАЙ МОВАЙ

ДЫКТАНТЫ ........................................................ 213

Папераджальны дыктант ........................................ 213
Каменціраваны дыктант ........................................ 214
Тлумачальны дыктант ........................................... 215
Дыктант «Правяраю сябе» ..................................... 216
Выбарачныя дыктанты ........................................... 217
Вольны дыктант ................................................... 219
Творчы дыктант .................................................... 221
Кантрольныя дыктанты ......................................... 222

ПЕРАКАЗЫ ........................................................ 224

ПЕРАКЛАДЫ ...................................................... 242

Пераклад-пераказ ............................................... 249

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Вучэбнае выданне*

**Бурак** Ірына Леанідаўна
**Лаўрэнаў** Алесь Ігаравіч
**Міхайлаў** Павел Аляксандравіч
**Старасценка** Таццяна Яўгенаўна
**Чайка** Наталля Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Дыктанты, пераказы, пераклады**

**9 клас**

Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў

*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Дз. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 30.11.2004. Фармат 84×108 $^1/_{32}$.
Папера друкарская № 2. Гарнітура «Школьная». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13,44. Ул.-выд. арк. 9,31. Тыраж 3100 экз. Зак. 3216.

Пасведчанне № 08-33-0.229996
аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі прадукту ад 11.09.2003.

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
ЛВ № 02330/0056807 ад 02.03.2004. Кантактны тэлефон (017) 210-18-98.
Рэспубліка Беларусь, 220123, Мінск, М. Багдановіча, 129а.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.